# XXL на пачатку XXI

## Манументальнае мастацтва Беларусі

Крыху больш за тыдзень праходзіла ў мінскім Палацы мастацтва Рэспубліканская выстаўка «Манументальнае мастацтва Беларусі». Усе сцены вялікай залы верхняга паверха пакрылі вялізарныя — метр на паўтара — плакаты, на якіх было прадстаўлена каля дзвюх сотняў скульптур, роспісаў ды іншых аб'ектаў. Іначай гэтыя работы немагчыма ўбачыць разам — з прычыны іх манументальнасці (ці, папросту, вялікага памеру). Канцэпцыя выставы была абумоўлена дэманстрацыяй «лепшых твораў за апошняе дзесяцігоддзе», таму меў месца конкурсны адбор. Выстаўка ладзілася дзвюма секцыямі Саюза мастакоў — жывапісу і скульптуры, таму экспазіцыя выразна падзялілася на жывапісную частку з творамі манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зробленымі ў інтэр'ерах і экстэр'ерах дзяржаўных і грамадскіх будынкаў, а таксама скульптурную, дзе рэпрэзентавалася манументальная, мемарыяльная і паркавая скульптура. Фотапрынты з выявамі рэалізаваных твораў былі разбаўлены фрагментамі кардонаў, эскізаў і рабочых мадэлей, а таксама макетамі няздзейсненых праектаў. Беларуская публіка ацаніла ўнікальнасць экспазіцыі і прадстаўленую магчымасць азнаёміцца з манументальнымі творамі, не выязджаючы на аб'екты: па словах кіраўніцтва Палаца, колькасць наведвальнікаў была ў два разы вышэйшай за звычайную.

## Ад mural да габелена

**ДАР'Я ІВАНОЎСКАЯ**

Падзеі кшталту гэтай выставы здараюцца ў нас не часта. Варта адзначыць надзвычай удалую экспазіцыю: выйгрышнае спалучэнне планшэтаў з прынтамі, жывапісу са скульптурай. У найбольш выгадных месцах залы экспанаваліся работы ключавых постацей — Аляксандра Кішчанкі, Гаўрыіла Вашчанкі, Зоі Літвінавай... Былі прадстаўлены разнастайныя тэхнікі — роспіс з рэльефам Юрыя Гаўрына, карціны Уладзіміра Зінкевіча, мазаікі Глеба Отчыка, Юрыя Каралевіча і іншых, дэкаратыўнае пано з металу Валерыя Міхайлюка, рэльефы Станіслава Гурскага, пано з керамічнай пліткі Алены Кудраўцавай, Алены Петрусевіч, пано з шамоту Наталлі Яўглеўскай, Тамары Курачыцкай і Івана Курачыцкага, роспіс, вітраж і скульптура Каміля Камала і іншыя творы. Выдатна, што дзякуючы шырокаму распаўсюджанню лічбавых тэхналогій з'явілася магчымасць лёгка фіксаваць працы. У папярэднія гады з-за перабудовы архітэктурных аб'ектаў і змены іх функцый страцілася шмат твораў. Іх фатаграфій таксама не засталося.

Адзначу і недахопы, заўважаныя на выставе: частка работ не мела подпісаў, важных каталожных даных (напрыклад, года стварэння). Засмучае, што не быў прадстаўлены шэраг важных аб'ектаў, такіх як роспісы Свята-Елісавецінскага манастыра, выкананыя студыяй Віктара Доўнара «IKONIQUE». Экспанаваліся і слабыя працы. Але ў цэлым гэтыя недахопы не псавалі агульнага ўражання.

Сёння манументальна-дэкаратыўнае мастацтва зведвае разнастайныя ўплывы і перапрацоўвае іх на аснове нацыянальных традыцый. А яны — багатыя. Згадаем, што вытокі МДМ ляжаць у XI—XII стагоддзях, калі тэрыторыя Беларусі знаходзілася ў зоне развіцця візантыйскай культуры (сучасны манументальны жывапіс праваслаўных храмаў таксама абапіраецца на візантыйскія традыцыі).Цікавыя тэндэнцыі ўзніклі ў XVII—пачатку XVIII стагоддзя, калі адбыўся сінтэз дзвюх плыняў сакральнага мастацтва — поствізантыйскай і еўрапейскай — з мастацтвам народным.

У XX стагоддзі важнай падзеяй сталася падрыхтоўка прафесійных мастакоў-манументалістаў у Тэатральна-мастацкім інстытуце, распачатая ў 1960-я гады. У гэтым жа дзесяцігоддзі была створана секцыя манументальнага жывапісу на Мінскім камбінаце Мастацкага фонду БССР. Тагачасныя творы сцвярджалі прастату і суровасць, у іх дамінавалі канструктыўная логіка, умоўнасць і пафаснасць. Увогуле ў перыяд панавання «суровага стылю» адбывалася манументалізацыя ўсіх відаў мастацтва. Рудыменты «суровасці» і грамадзянскага пафасу можна назіраць на выставе ў працах такіх аўтараў, як Уладзімір Крываблоцкі ці Аляксандр



**Алег Варвашэня, Канстанцін Селіханаў. Помнік Уладзіміру Караткевічу. Бронза, граніт. 2011. Кіеў, Украіна.**



**Уладзімір Кандрусевіч. Роспіс у касцёле Св. Язафата Кунцэвіча. Расоны. Аль фрэска. 2011.**



**Сяргей Бышнёў, Фёдар Драгун. Аляксандр Суша, Валерый Чайка. Мазаікі мемарыяльнай капліцы ў гонар іконы «Адзнака Найсвяцейшай Багародзіцы». Мінск. 2011.**

Кішчанка. У 1970-х—1980-х гадах пачынаюць праяўляцца іншыя тэндэнцыі: з'яўляюцца лірычныя, рамантычныя матывы, кампазіцыя ўскладняецца, развіваецца прастора, творы напаўняюцца сімваламі. Аўтары звяртаюцца да нацыянальных традыцый. Сведчанні таго можна прасачыць у работах Сямёна Дамарада, Валерыя Кавальчука, Мікалая Гуршчанкова...

У 1970-я гады ў Барысаве на базе камбіната прыкладнога мастацтва быў адкрыты габеленавы цэх. Габелены пачынаюць актыўна выкарыстоўвацца ў інтэр'ерах грамадскіх будынкаў. На выставе гэта тэхніка была прадстаўлена творамі Валянціны Бартлавай і Леаніда Бартлава, Эдуарда Рымаровіча, Ніны Пілюзінай, Галіны Крываблоцкай, Валянціны Крывашэевай, Ларысы Густавай, Наталлі Сухаверхавай.

Манументальнае мастацтва ў вялікай ступені залежыць ад заказчыка. З 1990-х гадоў апроч дзяржаўнага фарміруюцца яшчэ два віды заказу: прыватны і звязаны з культавай архітэктурай. Для дзяржаўнай замовы таго дзесяцігоддзя характэрны актыўны пошук. У гэты час зніжаецца ідэалагічны і экспертны кантроль, адкрываюцца межы. Узрастае значэнне канцэптуальнасці, адначасова назіраецца схільнасць да дэкаратыўных вырашэнняў (на выставе гэта выяўлена ў працах Фёдара Драгуна, Бекіра Смольскага, Баляслава Скрамблевіча і іншых).

Творы, выкананыя ў сферы прыватнага заказу, не нацэлены на раскрыццё вострай праблемы, не нясуць выхаваўчай ці іншых сацыяльных функцый. Іх задача — упрыгожванне, наданне індывідуальнасці архітэктуры. У большасці выпадкаў можна заўважыць уплыў заказчыка. Але акрамя камерцыйных работ з'яўляецца і цэлы шэраг цікавых творчых знаходак. (Такі від замовы прадстаўлены на выставе працамі Уладзіміра Зянько, Аляксея Хацкевіча, Аляксандра Некрашэвіча, Уладзіміра Зленкі, Паўла Асмакоўскага і іншых).

З сярэдзіны 1990-х гадоў пачынае набіраць сілу яшчэ адна адроджаная галіна манументальна-дэкаратыўнага жывапісу — праца ў праваслаўных і каталіцкіх традыцыях. Духоўны пачатак дамінуе ў работах Віктара Барабанцава, Сяргея Бышнёва, Аляксандра Сушы, Фёдара Драгуна, Валерыя Чайкі, Уладзіміра Кандрусевіча, Алеся Пушкіна, Васіля Матусевіча...

Выстава ў Палацы мастацтва засведчыла: манументальны жывапіс плённа развіваецца, зведваючы разнастайныя ўплывы і захоўваючы традыцыі. Відавочна, што варта чакаць якаснага росту ўзроўню твораў гэтага віду мастацтва.